БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ
УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА
ФАКУЛЬТЭТ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ

# «БЕРАГІНЯ»

## Культурна-адукацыйны праект



Захоўваем традыцыі Ствараем будучыню

Мінск, 2021

**Культурна-адукацыйны праект "БЕРАГІНЯ" (электронная кніга) / А.Я.Калошкіна, А.Л.Папкоўская, І.М.Іваноўская, К.М.Цубер. - Мінск: ФДА БДПУ, 2021. - 39 с.**

# Змест

«МАЙСТЭРНЯ РАМЁСТВАЎ»…………………………….. 4
- Ткацтва……………………………………………………….. 7
- Народны пояс…………………………………………….. 9
- Саломапляценне…………………………………….... 11

«З КАЗКАЙ ДА СЭРЦА»………………………………….… 20
«ЧАРОЎНАЯ СКАРБОНКА»………………………………. 29

# «МАЙСТЭРНЯ РАМЁСТВАЎ»



**Засваенне і папулярызацыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі**

# ❖Асноўныя мэты накірунка:



1. Узбагачаць веды аб этнакультурных каштоўнасцях у галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, спадчыне, нормах і традыцыях свайго этнасу.
2. Выхоўваць каштоўнаснае стаўленне да культурнай спадчыны свайго народа.
3. Прафесійная падрыхтоўка будучых педагогаў да фарміравання ў дзяцей дашкольнага ўзросту каштоўнасных адносін да нацыянальнай культуры сродкамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

**Сучасныя мастацкія промыслы Беларусі - важная і значная частка культуры рэспублікі.**

**Далёка за межамі краіны карыстаюцца вялікім поспехам дэкаратыўныя вырабы з саломы, куфэркі і шкатулкі, аздобленыя аплікацыяй і роспісам, керамічны посуд і пластыка, тканыя рушнікі, посцілкі, паясы. Працягваючы лепшыя традыцыі народнай творчасці, мастацкія промыслы з'яўляюцца і носьбітамі эстэтычных ідэалаў, невычэрпнай крыніцай прыгожага.**

**Вырабы мастацкіх промыслаў - увасабленне таленту народных майстроў, гарманічнага адзінства мастацтва і функцыянальнасці, своеасаблівая візітная картка Рэспублікі Беларусь.**



# ❖ ТКАЦТВА

**Асноўная мэта: далучэнне студэнтаў да нацыянальнай культуры Беларусі праз знаёмства з традыцыяй ткацтва.**

**Асноўныя задачы:**

**1. Мастацка-эстэтычнае выхаванне: развіццё і паглыбленне цікавасці да нацыянальнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і яго разнавіднасці – ручному ткацтву, фарміраванне ведаў, элементарных уменняў і навыкаў ручнога ткацтва.**



**2. Духоўна-маральнае выхаванне: фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці праз далучэнне да нацыянальнага мастацтва, павышэнне ўзроўню мастацкага і сацыякультурнага развіцця праз мастацкую творчасць у галіне ручнога ткацтва.**

**3. Развіццё творчага патэнцыялу: развіццё мастацкіх здольнасцяў, здольнасцяў да імправізацыі і камбінавання, ініцыятыўнасці.**



**ТКАЦТВА – адно з самых старажытных рамёстваў на Беларусі. З’явілася яно, па звестках археолагаў, магчыма, ужо ў III-м тысячагоддзі да н. э., у познім неаліце, а ў раннеславянскіх пляменаў мілаградскай і зарубінецкай культуры прадзенне і ткацтва былі ўжо досыць пашыраныя. Знаходкі асобных дэталяў ткацкіх станкоў і фрагментаў тканін эпохі Кіеўскай Русі на тэрыторыі Беларусі сведчаць, што ткацкая тэхніка знаходзілася тады на параўнальна высокім узроўні.**

**Ткацтва папярэднічала прадзенню, так як у выглядзе пляцення яно існавала яшчэ да таго, як чалавек адкрыў прадзільную здольнасць валокнаў некаторых раслін.**

**Розныя тэхнікі ткацтва, у большай ці меншай ступені, падобныя ва ўсіх славянскіх і іншых народаў, дазвалялі атрымліваць вырабы ўтылітарнага і дэкаратыўнага прызначэння з разнастайным малюнкам геаметрычнага, расліннага, зааморфнага характару, багатай каларыстычнай гаммы.**

# ❖ НАРОДНЫ ПОЯС



**НАРОДНЫ ПОЯС** - унікальная з'ява ў ручным ткацтве беларусаў, абумоўленая традыцыяй, сімволікай і абрадамі.

Паясы былі неабходным элементам мужчынскага і жаночага касцюмаў на працягу ўсёй гісторыі беларусаў. Вырабам паясоў з баваўняных, ільняных, канапляных нітак займаліся пераважна самі сяляне.

Увага, якая надавалася беларусамі поясу ў традыцыйным касцюме, тлумачыцца не толькі функцыянальнай неабходнасцю, але таксама і глыбокім сімвалічным зместам.

Нашэнне паяса звязвалася з маральным абліччам чалавека.

У канцы XIX — пач. XX ст. сімволіка пояса ў значнай ступені была забытая. Усё часцей паясы насілі па традыцыі, а не таму, што надавалі гэтаму нейкае значэнне.

Тэхніка вырабу беларускіх народных паясоў вызначаецца разнастайнасцю прыёмаў, большасць з якіх вядома многім народам з даўніх часоў. Паясы вілі, плялі на пальцах, на вілачцы, на сцяне, ткалі на дошчачках, на бердзечку, на ніту, на кроснах. Тэхналогія ў значнай меры абумовіла мастацкія асаблівасці традыцыйных паясоў.



# ❖ САЛОМАПЛЯЦЕННЕ

**Асноўная мэта: далучэнне студэнтаў да нацыянальнай культуры Беларусі праз знаёмства з саломапляценнем.**

**Асноўныя задачы:**

**1. Фарміраванне рознабаковых ведаў аб гісторыі і культуры (звычаях, абрадах, традыцыях, асновах традыцыйнага саломапляцення) Беларусі, здольнасці разумець з'явы нацыянальнай мастацкай культуры і іх ролю ў жыцці грамадства.**

**2. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, цікавасці да мовы, гісторыі і культуры Беларусі; павагі і цікавасці да культурных каштоўнасцяў іншых народаў і нацыянальнасцяў.**

**3. Развіццё ўмення ўспрымаць творы мастацтва, атрымліваць эстэтычную асалоду ад твораў дэкаратыўна - прыкладнога мастацтва, выказваць меркаванні, даваць эстэтычную ацэнку творам мастацтва.**

**4. Фарміраванне патрэбы да пераўтварэння навакольнай рэчаіснасці па законах прыгажосці.**

**5. Развіццё выяўленчых уменняў, навыкаў, іх творчых праяўленняў, імкнення і здольнасці мастацка - творчага самавыяўлення ў тэхніцы традыцыйнага саломапляцення.**




**ПЛЯЦЕННЕ** - **найстаражытнае сярод рамёстваў. Выкарыстанне саломы злакавых раслін для пляцення розных прадметаў ужытку адносіцца да таго перыяду гісторыі чалавечага грамадства, калі было засвоена земляробства. З культаваннем пшаніцы, ячменю, жыта з'явілася салома, якая знайшла разнастайнае прымяненне ў жыцці земляроба. Гэты матэрыял не патрабаваў ад селяніна якіх-небудзь дадатковых выдаткаў на нарыхтоўку або набыццё. Пасля ўборкі ўраджаю і абмалоту збожжа саломы заўсёды было ў дастатку.**

**У побыце беларусаў, як і ўсіх славянскіх народаў, салома выкарыстоўвалася не толькі ў абрадавых, рытуальных мэтах, але і для вырабу розных рэчаў бытавога прызначэння: посуду, галаўных убораў, пчаліных вулляў.**



**Майстар-клас па ткацтву падчас сустрэчы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з моладдзю**



**Майстар-клас па саломапляценню з прадстаўнікамі дэлегацыі Хэнаньскага ўніверсітэта і школы Ліньлюйг  Лінчжоў (Кітай)**



**Майстар-клас па ткацтву з прадстаўнікамі дэлегацыі Маскоўскага абласнога педагагічнага ўніверсітэта (Расія)**



**Выстава творчых  работ студэнтаў**
**факультэта дашкольнай адукацыі  БДПУ  «Родныя ўзоры»**



**Студэнты БДПУ – навучэнцы адукацыйных курсаў па ткацтву**




**Майстар-клас ва ўстанове дашкольнай адукацыі па ткацтву**



**Семінар-практыкум ва ўстанове дашкольнай адукацыі па ткацтву**

# «З КАЗКАЙ ДА СЭРЦА»



**Выхаванне духоўнай культуры сродкамі тэатральнага мастацтва**

## Асноўныя мэты накірунка:

- Адраджэнне беларускага народнага тэатра лялек «батлейка»
- Далучэнне студэнтаў да нацыянальнай культуры і гістарычнай спадчыны Беларусі

## Асноўныя формы працы:

- заняткі - гульні
- майстар-класы
- экскурсіі
- прадстаўленні
- удзел у фестывалях батлеечнага мастацтва
- святы і інш.




Студэнцкі лялечны тэатр «Адраджэнне Батлейкі»

# «АДРАДЖЭННЕ БАТЛЕЙКІ»

**Дасягненне пастаўленых мэтаў прадугледжвае вырашэнне наступных задач:**

**1. Праз вывучэнне беларускіх традыцый, абрадаў і фальклору фарміраваць у маладога пакалення пачуццё нацыянальнага гонару, любові да Радзімы.**

**2. Развіваць творчыя і мастацкія здольнасці студэнтаў, узбагачаць іх духоўны свет, вучыць аналізаваць, абагульняць, лагічна выказваць свае думкі.**

**3. Спрыяць развіццю і ўмацаванню калектывізму, пачуцця адказнасці за агульную справу.**



## За час свайго існавання тэатр быў узнагароджаны:

- **Дыпломам  II ступені (Рэгіянальны фестываль «Чароўны свет батлейкі»)**
- **Дыпломам  «За лепшае ўвасабленне нацыянальнай драматургіі» (Рэгіянальны фестываль «Чароўны свет батлейкі»)**
- **Дыпломам  «За лепшую акцерскую работу» (Рэгіянальны фестываль «Чароўны свет батлейкі»)**
- **Дыпломам  «За захаванне і развіццё традыцый беларускай батлейкі» (Прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва у РБ)**
- **Дыпломам за папулярызацыю батлеечнага мастацтва (Міжнародны фестываль батлеечных і лялечных тэатраў «Нябёсы»)**
- **Дыпломам за ўклад у развіццё батлеечнага мастацтва (Міжнародны фестываль батлеечных і лялечных тэатраў «Нябёсы»)**
- **Спецыяльным прызам за плённае супрацоўніцтва (Рэспубліканскі фестываль батлеечных і лялечных тэатраў «Нябёсы»)**
- **Дыпломам «За вопыт засваення батлеечнага  жанра » (Рэспубліканскі фестываль батлеечных і лялечных тэатраў «Нябёсы»)**
- **Дыпломам «За прафесіяналізм і адданасць батлеечнаму мастацтву» (Рэспубліканскі фестываль батлеечных і лялечных тэатраў «Нябёсы»)**

## Батлеечнае мастацтва. Гісторыя і традыцыі

Беларускі народны батлеечны тэатр з'яўляецца адным з самых старажытных відаў беларускага мастацтва. Назва «батлейка» паходзіць ад горада Віфліем (Бэтлеем), дзе, згодна біблейскага падання, нарадзіўся Ісус Хрыстос. Іншыя варыянты назвы гэтага старажытнага тэатра - «батлеемка», «остмейка» або «жлоб».

Прынята лічыць, што тэатры батлеечнага тыпу з'явіліся ў Еўропе ў XV ст. Для беларускага батлеечнага тэатра характэрныя тыя ж асаблівасці, што і для еўрапейскіх батлеечных тэатраў сярэднявечча. Батлеечныя спектаклі сваімі сюжэтамі звычайна адлюстроўвалі сацыяльныя і рэлігійныя працэсы, якія мелі месца ў грамадстве.

Рэпертуар батлеек можна было падзяліць на два жанравыя напрамкі: "высокі" - рэлігійная тэматыка і "нізкі" - сатырычныя сцэнкі з народнага жыцця. У сувязі з гэтымі асаблівасцямі батлеечныя скрыні будаваліся па некалькіх розных тыпах. Кожнае месца батлеечнай скрыні мела свой асаблівы сімвалізм: з левага боку верхняга яруса звычайна знаходзіўся «рай», з правага боку ніжняга яруса – «пекла» .

**У Беларусі існавала некалькі тыпаў батлеечных тэатраў:**

- **аднапавярховыя**
- **двухпавярховыя з рухомымі лялькамі**
- **двухпавярховыя з вежай**
- **батлейкі па прынцыпе ценявога тэатра**
- **батлейкі з празрыстымі дэкарацыямі, якія мяняліся падчас спектакля**
- **батлейкі-«зоркі»**



**На Міншчыне ў канцы XIX ст. была распаўсюджана двухпавярховая батлейка са спецыяльнай вежай. Аздабленню батлейкі надавалася вялікае значэнне. Яна ўпрыгожвалася геаметрычнымі фігуркамі з саломы і паперы, разьбой, вышыўкай. Сама батлейка выраблялася з фанеры і драўляных рэек.**

**На верхнім ярусе двух'яруснай батлейкі паказваліся біблейскія сюжэты, часта звязаныя з Калядамі. Таму ўпрыгожванне гэтага яруса было багатым, з элементамі царкоўнай атрыбутыкі. На задніх сценках размяшчаліся абразы, зоркі, крыжы і кампазіцыі біблейскай тэматыкі. У цэнтры знаходзілася высокая арка, аблепленая залатой паперай, у глыбіні яе быў алтар. Па баках - дзве меншыя аркі, якія служылі для ўваходу і выхаду лялек. Столь была абсыпана зоркамі з каляровага шкла. Ніжні ярус афармляўся як палац Ірада, дзе праходзілі бытавыя сцэны. У цэнтры размяшчаўся трон Ірада.**

## Беларуская батлейка к. XIX – п. XX ст. мела сямейныя традыцыі

У пастаноўках прымаў удзел невялікі музычны ансамбль, які складаўся з членаў сям'і батлеечнікаў (дарослых і дзяцей) .

Звычайна трупа батлеечнікаў прыязджала ў цэнтр горада, мястэчка, вёскі і размяшчалася ў людным месцы.

Для мяшчан хаджэнне з батлейкай было аматарскім заняткам, сродкам дадатковага заробку.



Майстар-клас па традыцыйнай батлейцы «Лялечная казка»

## Віды прадстаўленняў батлейкі

- біблейска-містэрыяльныя (сцэны з біблейскай гісторыі)
- жарты і камедыйныя сцэнкі (у іх знаходзілі адлюстраванне палітычныя і грамадскія падзеі)
- сцэнкі-дыялогі (бытавыя замалёўкі, часам з сацыяльнай скіраванасцю)



**Калядныя інсцэніроўкі ў БДПУ**

На тэрыторыі Беларусі найбольшае распаўсюджванне атрымалі лялькі на цвёрдым стрыжні. Стрыжань і цела лялькі звычайна вырабляліся з мяккіх парод дрэва, набіваліся ватай, рыззём, паперай. Памеры лялек звычайна былі ў сярэднім 23-27см. Але сустракаліся памеры і да 35 см (звычайна такімі рабіліся адмоўныя персанажы).



**Майстар-клас па традыцыйнай батлейцы для выхаванцаў установы дашкольнай адукацыі**

# «ЧАРОЎНАЯ СКАРБОНКА»



**Арганізацыя і правядзенне народных святаў і сучасных фальклорных фэстаў**

❖ **Мэта накірунка:** **далучэнне студэнтаў да нацыянальнай культуры Беларусі праз знаёмства з нацыянальнымі традыцыямі.**

**Асноўныя задачы:**

1. **Далучаць студэнтаў да нацыянальнай культуры сродкамі беларускіх народных гульняў, абрадаў, святаў.**
2. **Праз вывучэнне беларускіх народных гульняў, абрадаў і святаў развіваць творчыя здольнасці студэнтаў, вучыць аналізаваць змястоўны кампанент методык працы з дзецьмі.**
3. **Выхоўваць у студэнтаў маральна-эстэтычныя каштоўнасці.**



**Свята «Дзень вышыванкі»**


Свята «Дзень маці» ў бібліятэцы

## Асноўныя формы працы:

- майстар-класы
- святы
- забавы
- абрады



Беларускае свята ва ўстанове дашкольнай адукацыі



**Тэматычная пляцоўка «Беларусі-Я-дачка»**
**(беларускія народныя гульні для дзяцей дашкольнага ўзросту)**




Свята «Старонка беларускай кнігі»



Свята «Ідуць Калядкі»



Дзень беларускай мовы на факультэце дашкольнай адукацыі БДПУ



Свята «Гуканне вясны» (мінскі заапарк)



**Свята «Масленіца» (мінскі заапарк)**

## Базы рэалізацыі праекта :

- Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача
- УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»
- ДК АЎ «Мінскі заапарк»
- УК «Бібліятэка №6 г. Мінска»
- УДА «Яслі-сад № 28 г. Мінска»
- УДА «Яслі-сад № 35 г. Мінска»
- УДА «Яслі-сад № 115 г. Мінска»
- УДА «Яслі-сад № 378 г. Мінска»
- УДА «Яслі-сад № 394 г. Мінска»
- УДА «Яслі-сад № 403 г. Мінска»
- УДА «Яслі-сад № 436 г. Мінска»
- УДА «Яслі-сад № 445 г. Мінска»
- УДА «Яслі-сад № 489 г. Мінска»
- УДА «Яслі-сад № 492 г. Мінска»
- ДУА «Сярэдняя школа № 6 г. Мінска»
- ДУА «Сярэдняя школа № 87 г. Мінска»
- ДУА «Сярэдняя школа № 125 г. Мінска»

**Калошкіна Алена Яўгенаўна**
**Папкоўская Алена Леанідаўна**
**Іваноўская Іна Міхайлаўна**
**Цубер Кацярына Мікалаеўна**

**Культурна-адукацыйны праект «БЕРАГІНЯ»**

**Канцэпцыя праекта В.М.Анцыпіровіч, А.М.Зыль**
**Тэхнічнае рэдактаванне і кампутарная вёрстка**
**Д.М.Клемянкова**
**Фота А.А.Галюк, В.І.Кокіц**

**На вокладцы: выхаванцы ДУА «Яслі-сад № 403 г. Мінска»**